Доклады Национальной академии наук Беларуси

2014 январь–февраль Том 58 № 1

УДК 94(476)(36)–912.43:93/99

*С. П. ВІЦЯЗЬ*

# ПРАБЛЕМА АРЭАЛА ПРУСАЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ ВЫЗНАЧЭННІ

*(Прадстаўлена акадэмікам М. П. Касцюком)*

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,*
*мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск* *Паступіла 07.02.2014*

Прусы, як вядома, не стварылі тытульнага дзяржаўнага ўвасаблення. У канцы XIII ст. яны былі падпарадкаваныя ваенна-рэлігійнай арганізацыяй Тэўтонскага Ордэна, і ў выніку былі часткова асіміляваныя перасяленцамі на захопленыя землі (пераважна немцамі), часткова ўліліся ў склад насельніцтва суседніх тэрыторый – палякаў, літоўцаў, а таксама беларусаў.

Тэма арэала прусаў прадстаўлена ў еўрапейскай гістарыяграфіі ў адметным кантэксце, выразна палітызаваным, звязаным з праблематыкай тэрытарыяльных спрэчак. Паколькі ў прусаў не склалася ўласнае гістарыяграфічнае кола даследчыкаў, іх спадчыну вывучалі прадстаўнікі розных народаў і дзяржаў, у першую чаргу тыя, што валодалі іх землямі альбо прэтэндавалі на іх. Адпаведна, найбольш прадстаўнічыя пазіцыі ў гістарыяграфіі атрымалі вызначэнні нямецкіх і польскіх вучоных. Звароты расійскіх навукоўцаў да прускай тэматыкі да сярэдзіны XX ст. насілі выключна эпізадычны характар. Тэндэнцыя дысгармоніі захоўваецца ў расійскай навуцы дагэтуль: у вывучэнні спадчыны прусаў вылучаюцца сістэмныя археалагічныя даследаванні другой паловы XX – пачатку XXI ст., у той час як у галіне гісторыі адзначаецца «адсутнасць інтэлектуальнай традыцыі вывучэння даўніны рэгіёна» [1]. Гэты гістарыяграфічны дысбаланс актыўна выпраўляецца шэрагам навейшых даследаванняў, але праблема арэала застаецца адчыненай. Між іншым, назіраецца ўзрастанне навуковай увагі да гісторыі прусаў з боку еўрапейскіх даследчыкаў сярэднявечча, у т. л. беларускіх, у кантэксце высвятлення міжрэгіянальных сувязяў і уплываў рознага роду – этнічных, эканамічных, сацыяльных, палітычных, рэлігійных, культурных [2, с. 8–38].

Варта папярэдне адзначыць дыяхронны аспект праблемы арэала прусаў: працяглы перыяд (V–XIII стст.) іх аўтаномнага бытавання (ад афармлення прусаў да іх падпарадкавання Ордэнам) схіляе да неабходнасці абмеркавання параметраў зменлівасці арэала ў часе.

Арэал старажытных прусаў вызначаецца праз комплексны аналіз гістарычных даных, суадносна з паведамленнямі пісьмовых крыніц, матэрыялаў археалогіі, даных мовазнаўства. Зыходнай пазіцыяй з’яўляецца высвятленне арэала прусаў згодна з іх этнічнымі вызначэннямі (4 рознакаранёвыя тыпы («эст-», «прус-», «віт-», «сем[б]-») [2, с. 47–53]. Найдаўнейшыя паведамленні па гэтай тэме ўключаюць узгадкі 8 раннесярэднявечных пісьмовых крыніц (IX–XI стст.) [2, с. 47–53]. Яны змяшчаюць звесткі аб месцазнаходжанні эстыяў (2 паведамленні), прусаў (4), Вітланда (1), Самланда і сэмбаў (1). Адзінкавыя крыніцы XIII–XVI стст. маюць звесткі аб месцазнаходжанні Прусіі і прусаў пасля ордэнскага гвалту. Раннія крыніцы адзначаюць адэкватнасць арэалаў эстаў, сэмбаў, прусаў, Прусіі, Вітланда, Самланда.

Геаграфічныя арыенціры месцазнаходжання ўзгаданых арэалаў (абагульненыя прасторавыя вызначэнні, а таксама ўскосныя спалучэнні адзнак) дазволілі даследчыкам рэканструіраваць лакалізацыю старажытных прусаў у рэгіёне Паўднёва-Усходняй Балтыкі, на ўсходнім беразе Балтыйскага мора, на ўсход ад ракі Вісла, на поўнач ад Польшчы, на паўночны захад ад Русі [3, с. 408; 4] (мал. 1–3). Адзначаныя крыніцы прадстаўляюць абагуленыя прасторавыя арыенціры знаходжання прусаў, але не даюць дакладных каардынат, а таксама не характары-




Мал. 1. Этнапалітычнае становішча ў рэгіёне Цэнтральнай Еўропы ў сярэдзіне IX ст., па звестках «Баварскага географа» (рэканструкцыя Й. Хермана): 38 – «Bruzi»




Мал. 2. Этнапалітычнае становішча ў рэгіёне Цэнтральнай Еўропы ў канцы X ст., па звестках Dagome Iudex (рэканструкцыя Х. Лаўмяньскага)




Мал. 3. Маршрут падарожжа Адама Брэменскага (канец XI ст.)

зуюць дынамікі рассялення. Асобныя крыніцы паведамляюць пра ландшафт прускіх земляў, вылучаюць іх спецыфічную рысу – знаходжанне сярод «непераадольных багнаў». Аналіз геамарфалагічных абставін рассялення прусаў дазволіў даследчыкам (Е. Сембжыцкі, Х. Лаўмяньскі, В. Шыменас) зрабіць выснову аб тым, што паміж пасяленскімі скупеннямі прусаў ляжалі незаселеныя памежныя пушчы, верагодна, сакралізаваныя.

Некаторыя познія крыніцы, у т. л. «Хроніка» Пятра з Дусбурга, «Гісторыя» Яна Длугаша, выкладаюць шэраг адносна дакладных геаграфічных каардынат і ўскосных звестак аб тэрытарыяльным падзеле арэала прусаў, згодна з чым выконвалі яго рэканструкцыю даследчыкі Германіі (мал. 4), Польшчы (мал. 5), СССР (мал. 6) з высокай ступенню ўзаемнасці. Але неабходна ўсведамляць, што характарыстыка арэалаў прускага рассялення ў пісьмовых крыніцах прама не прадстаўлена. Іх высвятленне з'яўляецца менавіта рэканструкцыяй гістарычных абставін [5]. Асабліва крытычна гэта палажэнне ставіцца да перыяду ранняга сярэднявечча, якое аддалена ад згаданых позніх пісьмовых крыніц на многія стагоддзі. Прадстаўляецца важным падчас разгляду дадзенага пытання кіравацца прынцыпам аўтэнтычнасці, вартасць якога адзначаў гістарычны географ С. А. Кавалеўскі: «Гісторык, які не ўлічвае тых змяненняў, што адбываюцца на працягу вякоў... нязменна будзе трапляць у памылку, адрывая гістарычныя падзеі ад сучасных ім рэальных абставін» [6].

Высвятленне межаў і картаграфаванне прускіх земляў здзяйснялася з XIV ст. Вылучаюцца некалькі асноўных падыходаў у галіне гістарычнай геаграфіі прусаў.

*Першы падыход, кансерватыўны.* Праблема тэрыторыі прусаў была адной з прыярытэтных тэм нямецкай гістарыяграфіі. Гэта натуральна абумоўлівалася палітычнымі падставамі: імкненнем Тэўтонскага Ордэна і яго паслядоўнікаў апраўдаць гістарычнымі сродкамі падпарадкаванне нямецкімі находнікамі мясцовых жыхароў, прусаў. Зместам той пазіцыі былі, з аднаго боку, рэлігійная місія ахрышчэння насельнікаў узбярэжжа Балтыйскага мора, з другога – захоп іх земляў. Наступствам той пазіцыі былі вызначэнні, выкладзеныя ў працы «Пруская хроніка» пачатку XIV ст. храніста ордэна Пятра з Дусбурга [7]. Ён акрэсліў рэгіён Усходняй Балтыі, захоплены Ордэнам, абагульнена, як «землі прусаў». Аўтар адзначыў у іх складзе 11 так званых земляў. Іх пералік уключае наступныя: 1 – Хелмінская зямля і Любовія, 2 – Памезанія, 3 – Паге-




Мал. 4. «Землі» прусаў XIII–XIV стст. па звестках Пятра з Дусбурга (рэканструкцыя М. Тэппена; афармленне А. Кушнера)

занія, 4 – Вармія, 5 – Натангія, 6 – Самбія, 7 – Надровія, 8 – Скаловія, 9 – Судовія, 10 – Галіндыя, 11 – Барта і Пліка Барта (мал. 4–7). На падставе вызначэняў храніста быў створаны дадзены падыход, які магчыма ацаніць, як прыклад суб'ектыўнага вырашэння арэальнай праблемы, менавіта з боку нямецкіх гісторыкаў [3; 5]. Крытычны аналіз пераліку Пятра з Дусбурга па звестках пісьмовых крыніц паказаў яго недакладнасць нават для перыяду XIII–XIV стст., якому была мэтава прысвечаная яго «Хроніка». Напрыклад, у пералік не патрапіў шэраг прускіх «земляў», вядомых па звестках іншых крыніц (Ланзанія, Перагодзія, Селонія, Сасінія, Паслек ды інш.) [8; 9]. З другога боку, з самога пераліку 11 вышэйназваных «зямель» толькі 7 былі заселеныя непасрэдна прусамі [5; 8–10].




Мал. 5. Этнапалітычнае становішча ва Ўсходняй Балтыцы ў XIII ст. («землі прусаў»)
(рэканструкцыя і афармленне Х. Лаўмяньскага)

Тым не меней, для першага падыходу прымаўся погляд аб спрадвечнай нязменнасці арэала прусаў ад старажытнасці да фіксацыі іх становішча ў названай «Хроніцы». Нямецкія гісторыкі не надта абцяжарвалі сябе пошукам аргументаў для высвятлення рэальнага становішча прускага рассялення ў раннім сярэднявеччы (сярод адзінкавых аналітычных прац – работы першай паловы ХХ ст. О. Шлютэра [11], Х. і Г. Мортэнсэнаў [12; 13]). Строга кажучы, такія аргументы (гістарычныя, археалагічныя) на перыяд да сярэдзіны ХХ ст. яшчэ не існавалі. Таму крыніцазнаўчая лакуна запаўнялася абагульненай рэтраспекцыяй праз стагоддзі вызначэнняў Пятра з Дусбурга, іншых сярэднявечных крыніц. Такое выключна гіпатэтычнае палажэнне не атрымала належнага крытычнага гістарычнага абмеркавання, але набыло статус агульнапрынятай догмы. Гэты падыход звычайна выкарыстоўваецца ў аглядна-абагульняючых і навукова-папулярных працах па прускай тэматыцы. Таму ў сувязі з шырокай распаўсюджанасцю гэтага падыходу (неабгрунтаванага і памылковага для перыяду раней за XIII ст.), які фактычна набыў статус гістарыяграфічнай традыцыі, пэўнага геаграфічнага канону, прадстаўляецца мэтазгодным выкарыстоўваць яго вызначэнні ў якасці прасторавых арыенціраў (у далейшым у дужках будуць адзначацца нумары прускіх «зямель», згодна з пералікам Пятра з Дусбурга).




Мал. 6. Этнапалітычнае становішча ва Ўсходняй Балтыцы ў XIII ст. («землі прусаў»)
(рэканструкцыя В. Пашуты, афармленне І. Галубцова)

*Другі падыход, этнічна арыентаваны*. Створаны на падставе аналітычных удакладненняў арэальных вызначэнняў Пятра з Дусбурга. Згодна з ім, да прусаў адносяць толькі тыя землі з яго пераліку, якія былі заселеныя непасрэдна прусамі. Такі падыход распрацоўваўся, у пераважнай ступені, навукоўцамі Польшчы па даных пісьмовых крыніц (Х. Лаўмяньскі, К. Тымянецкі, К. Бучэк, Г. Лабуда, Я. Паверскі і інш.). Гэта акалічнасць мае палітычныя падставы, паколькі Польшча вяла тэрытарыяльныя спрэчкі за землі ўзбярэжжа Балтыкі з Тэўтонскім Ордэнам і яго паслядоўнікамі з XIV да сярэдзіны XX ст., калі, нарэшце, прускія землі былі перададзены ад Германіі да СССР (1/3) і Польшчы (2/3). Заўважым, што ўзгаданыя пісьмовыя крыніцы ствараліся ў познія часы, пасля ордэнскага прымусу. Таму тыя матэрыялы дазваляюць толькі акрэсліваць міжэтнічныя кантактныя зоны (найперш, пруска-польскія), выяўляць пэўныя кірункі рассялення, але не прадстаўляюць факталагічных даных для ранняга сярэднявечча. Адпаведна, арэальныя вызначэнні на падставе другога падыходу таксама як і першага носяць гіпатэтычны характар, з'яўляюцца рэтраспекцыяй, але несумненна больш абгрунтаванай.

У цэлым, для другога падыходу прымаецца палажэнне аб асваенні прусамі арэала (па «Хроніцы») праз іх рассяленне з Самбіі на мацярык у перыяд VII–VIII стст. [14, s. 289, 295]. Дыскусія па пытаннях этнічнага зместу «зямель» з пераліку Пятра з Дусбурга атрымала наступныя ўдакладненні. Тэндэцыйнасць аднясення да прусаў Хелмінскай (Кульмскай) зямлі (1), якая спрадвечна была польскай, адзначалі В. Кентжыньскі (1874, 1877, 1882), Л. Вэбер (1878), К. Казіске (1934). Яе першапачатковую прыналежнасць прусам, якую толькі кароткачасова захапіла Польшча



Мал. 7. Прускія «землі» ў V і XIII стст. (рэканструкцыя У. Кулакова, Х. Лаўмяньскага, афармленне С. Віцязя, А. Лукашова)

напярэдадні прыходу ордэна, меркавалі Г. Хенкель (1886), Г. Плэн (1900, 1904–1905). Пазіцыю Пятра з Дусбурга абараняў Х. Харм’янц (1936). Аргументаваныя доказы на карысць яе польскай (славянскай) прыналежнасці прывялі Я. Парадоўскі (1936, ён жа ўдакладніў палажэнне пруска-хелмінскай (пруска-польскай) мяжы), Я. Паверскі (1970).

Часам тэрытарыяльныя дыскусіі перакрочвалі традыцыйныя тэмы. Так, дыскутавалася нават этнічная прыналежнасць зямлі Памезаніі (2) на правабярэжжы Ніжняй Віслы, побач з Хелмінскай зямлёй. Яе залічалі да польскіх зямель В. Кентжыньскі (1874), Ф. Дуда (1909), С. Куйот (1913–1918, 1924). Аргументавана адносілі яе да прусаў В. Лега (1929, 1930), Х. Лаўмяньскі (1935), Я. Паверскі (1970). З іншага боку, выказвалася меркаванне і аб бытаванні прусаў на левым беразе Ніжняй Віслы: Ф. Лорэнтц (1905), В. Лега (1929, 1930).

Прыналежнасць Скаловіі (8) да прусаў падтрымліваў О. Натан (1937). Лічылі скальваў адгалінаваннем заходнебалцкага племені куршаў К. Энгель (1931, 1939), В. Нагявічус (1935), Й. Хоффман (1939, 1941). Р. Валкайтэ-Кулікаўскене (1968, 1970), А. Таўтавічус (1977, 1987, 1996), В. Шыменас (1990, 1994) сцвярджалі, што скальвы – асобнае заходнебалцкае племя [15, s. 44–101, 173–181; 16]. Такі ж пункт гледжання падтрымлівае У. Кулакоў (1994, 2003) [10; 17]. Мяркуецца, скальвы вылучыліся з агульнага масіва заходнебалцкай культуры ў II ст. н. э., яшчэ да фарміравання прусаў.

Судовія (9), згодна з другім падыходам, лічыцца адной з правінцый яцвягаў. Самі яцвягі сёння ацэнваюцца як асобнае (побач з прусамі і інш.) заходнебалцкае племя [2, с. 69–84]. З іншага боку аўтар абгрунтоўвае палажэнне аб познім (з IX ст.) фарміраванні яцвягаў на аснове прускай культуры [2, с. 163–170], але гэта пазіцыя складзена па-за межамі дадзенага падыходу (гл. трэці падыход).

Галіндыя (10) суадносіцца з адным з заходнебалцкіх народаў – галіндамі (носьбіты багачоўскай археалагічнай культуры вылучыліся ў пачатку I тыс. н. э. з масіва заходнебалцкай культуры) [18]. Старажытнае насельніцтва галіндаў да сярэдзіны I тыс. н. э. у значнай ступені пакінула мацярынскі арэал (Цэнтральныя Мазуры). Рэшткі галіндаў, па меркаванні Х. Лаўмяньскага (1931–1932), знішчылі палякі ў перыяд другой паловы XI – пачатку XIII ст. [19]. У выніку на месцы Галіндыі заставалася малазаселеная памежная пушча, што зафіксаваў у пачатку XIV ст. Пётр з Дусбурга ў разгорнутым каментарыі сваёй «Хронікі», узгадаўшы той рэгіён як *terra desolata* («спустошаная зямля») [7]. Х. Лаўмяньскі той арэал вызначаў як «Пушча Галіндская» (незаселены памежны лясны масіў) [19; 20]. Такім чынам, па другім падыходзе вылучаецца наступны

peralік этнічна *прускіх* земляў са складу вызначэнняў Пятра з Дусбурга: усіх 7, за выключэннем «зямель» 1, 8, 9, 10 (мал. 7).

Існуе значны недахоп першага і другога падыходаў – меркаванне, што прускі арэал працяглы час заставаўся нязменным у часе. На гэтай падставе выконвалася спрошчаная рэтраспекцыя арэала вышэйзгаданых «зямель» па «Хроніцы» Пятра з Дусбурга для рэканструкцыі ранняга арэала прусаў. Натуральна, такі падыход – ацэнка арэальнага становішча на падставе звестак, пазнейшых на многія стагоддзі – з'яўляецца некрытычным па сутнасных параметрах і патрабуе крыніцазнаўчых удакладненняў. Немагчыма сцвярджаць, у які менавіта час там знаходзіліся прусы – пісьмовыя і лінгвістычныя крыніцы не даюць аб тым даных. Таму, вынікі гэтага падыходу таксама немагчыма прызнаць паўнаважкімі для ўсёй 800-гадовай прускай эпохі.

*Трэці падыход, археалагічна арыентаваны.* Гэты падыход мае прынцыповае адрозненне ад папярэдніх у крыніцазнаўчым плане, паколькі ён грунтуецца найперш на археалагічных даных, у суаднясенні са звесткамі пісьмовых крыніц. Адпаведна, да прусаў адносяцца толькі тыя землі, якія былі непасрэдна заселеныя прусамі, па вызначэннях археалогіі.

Дадзены падыход, найбольш рэалістычны і дасканалы, абапіраецца на вынікі археалагічных даследаванняў рэгіёна і патрабуе іх максімальна поўнага ўліку. Абгрунтаванае ўяўленне аб тэрыторыі раннесярэднявечных прусаў з'явілася толькі ў пачатку XX ст., пачынаючы з публікацыі археалагічнай карты арэала распаўсюджання даўніх прускіх пахавальных помнікаў, выкананай Э. Холлакам (1908) [21]. Пазней О. Шлютэр (1921) здзейсніў гіпатэтычную рэтраспекцыю палеагеаграфічнага становішча ў прускіх землях XI–XII стст. [11], абапіраючыся пераважна на матэрыялы пазнейшых пісьмовых крыніц XIII–XIV стст. і арыенціры Э. Холлака. Але ў цэлым прадстаўленні аб тэрыторыі раннесярэднявечных прусаў выкладаліся ў высокай ступені гіпатэтычна. Праблема ўскладнялася агульнай нераспрацаванасцю нямецкімі даследчыкамі пасяленчаскай археалогіі прусаў. Польскія навукоўцы выявілі зоны міжэтнічных кантактаў і акрэслілі зыходныя арэалы рассяленняў. Паўнавартасныя распрацоўкі па арэальнай праблеме прадставілі расійскія археолагі (пераважна працы У. Кулакова) [5; 10; 17; 22; 23] у канцы XX ст. Вывучэнне




Мал. 8. Арэалы заходнебалцкіх плямёнаў (прусы, куршы, ламаты, скальвы, яцвягі) і іх суседзяў (славяне, аўкштайты, жэмайты) у VII–X стст. (па У. Кулакову)

пахавальных і жыллёвых помнікаў, сістэматызацыя матэрыялаў раскопак, каталагізацыя масіваў даных, назапашаных інтэрнацыянальнымі намаганнямі еўрапейскіх навукоўцаў, мела вынікам складанне факталагічнага грунту для рэканструкцыі пасяленчаскай сітуацыі прусаў. На фоне традыцыйна распаўсюджаных «вялікіх» арэалаў першага і другога кірункаў – гэты абшар для ранняга сярэднявечча выглядае нязвыкла «сцісла» (мал. 8) і прадстаўляе прускую тэрыторыю, якая ўключае паўвостраў Самбія (адпавядае «зямлі» Самбія (6) і паўночнай частцы «зямлі» Натангія (5), па першым і другім падыходах), а таксама адгалінаванне на паўднёвы захад – узбярэжжа Віслінскага заліва, да р. Нагата (паўночныя часткі «зямель» Натангія (5), Вармія (4) і Пагезанія (3), і адгалінаванне на поўдзень, па басейне ракі Лына (па памежжах «зямель» Натангія (5) і Надровія (7), а таксама Вармія (4) і Барта (11)) [24]. Мацярынскі арэал прусаў – вобласць, дзе адбывалася складанне ўласна прускай культуры (сярэдзіна І тыс. н. э.) уключае паўвостраў Самбія і прылеглае з захаду ўзбярэжжа Віслінскага заліву (мал. 7). Асваенне вышэйакрэсленага раннесярэднявечнага рэгіёна адбывалася двума хвалямі прускага рассялення з мацярынскага арэалу – у другой палове XI і пачатку XII ст. (мал. 9) [5; 10; 17; 22]. Такім чынам, «запаўненне» прусамі рэгіёна па Пятру з Дусбурга адбывалася толькі за два стагоддзі да стварэння яго «Хронікі». Тады ж здзяйснялася і актыўнае непасрэднае памежнае кантактаванне з суседзямі, найперш славянамі – палякамі. Найбольш поўны масіў даных па гэтым падыходзе засвоены расійскімі археолагамі [2, с. 43–44, 351–357; 23], што вызначае адпаведныя перадумовы высвятлення аб’ектыўнага стану прускага рассялення і накіроўвае для ацэнкі трэцяга падыходу арэла прусаў як найбольш крыніцазнаўча абгрунтаванага і дасканалага.

Варта адзначыць, што на сённяшні дзень у большасці публікацый па прускай тэматыцы прадстаўлены арэальныя распрацоўкі па першым падыходзе. Гэта выклікана тым, што аўтараў у большай ступені цікавіць не гісторыя саміх прусаў, а палітычныя наступствы той гісторыі, размеркаванне ва ўласнасць іх земляў. Навуковыя гістарычныя публікацыі прэзентуюць больш узважаны другі падыход. Навейшы трэці падыход знаходзіцца ў стадыі асэнсавання навуковай грамадскасцю.

У выніку вылучаюцца наступныя важныя акалічнасці: рэканструкцыі арэала прусаў канцэнтруюцца вакол трох вышэйакрэсленых падыходаў, якія ўвасабляюць змястоўна розныя гістарыяграфічныя пазіцыі. У сваю чаргу, тыя пазіцыі гістарыяграфіі абумоўленыя рознымі масівамі гістарычных крыніц. Такім чынам, выяўленне адэкватнага крыніцазнаўчага падмурку арэаль-




Мал. 9. Рассяленне прусаў у пачатку ІІ тыс. н.э.: А – мяжа другой паловы XI ст.; Б, В – межы пачатку XII ст. (па У. І. Кулакову, з дапаўненнямі С. П. Віцязя)

най праблемы прывяло да прынцыповага перагляду гістарыяграфічных вызначэнняў, а таксама прадэманстравала надзённую запатрабаванасць увядзення матэрыялаў археалагічных даследаванняў у рэчышча гістарычнай рэканструкцыі.

## Літаратура


1. *Гончаров В. В.* История Восточной Пруссии и Калининградской области в отечественной и зарубежной историографии: автореф. дисс. ... канд. ист. наук. М., 2009. – 30 с.
2. *Віцязь С. П.* Прусы і яцвягі ранняга сярэднявечча: этнакультурныя трансфармацыі ў Верхнім Панямонні. Мінск, 2012. – 411 с.
3. *Гуревич Ф. Д.* // Материалы и исследования по археологии СССР. М.; Л., 1960. Вып. 76. С. 328–451.
4. *Щавелева Н. И.* Польские латиноязычные средневековые источники. М., 1990. – 210 с.
5. *Кулаков В. И.* // Балто-славянские исследования–1985. М., 1987. С. 95–101.
6. *Ковалевский С. А.* // Изв. Крымского отд-ния географического общества СССР. 1957. Вып. 4. С. 18–24.
7. *Петр из Дусбурга.* Хроника земли Прусской. М., 1997. – 384 с.
8. *Biskup M., Labuda G.* Dzieje Zakonu Krzyżackiego w Prusach. Gospodarka – Społeczeństwo – Państwo – Ideologia. Gdańsk, 1986. – 624 s.
9. *Łowmiański H.* // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historyca. Poznań, 1985. N 1. S. 3–105.
10. *Кулаков В. И.* Становление европейского средневекового города. М., 1989. С. 80–106.
11. *Schlüter O.* Wald, Sumpf und Siedlungsland in Altpreuβen vor der Ordenszeit. Halle, 1921. – 96 s.
12. *Mortensen H., Mortensen G.* Die Besiedlung des nordöstlichen Ostpreussens bis zum Beginn des 17 Jahrhunderts: in 3 bd. – Leipzig, 1937–1938.
13. *Mortensen-Heinrich G.* Beiträge zu den Nationalitäten- und Siedlungsverhältnissen von Preussischen Litauen. Berlin, 1927. – 87 s.
14. *Wróblewski W.* // Słowianie i ich sąsiedzi we wczesnym średniowieczu. Lublin; Warszawa, 2003. S. 165–181.
15. *Tautavičius A. Z.* Lietuvos TSR Archeologijos Atlasas. Vilnius, 1977. T. 3: I–XIII a. pilkapynai ir senkapiai. – 192 p.
16. *Šimėnas V.* // Vidurio Lietuvos Archeologija. Vilnius, 1994. S. 10–20.
17. *Кулаков В. И.* // Тр. V Междунар. конгресса славянской археологии: в 3 т. М., 1997. Т. 3. В. 1а: Города, их культурные и торговые связи. С. 116–124.
18. *Nowakowski W.* // Wiadomości Archeologiczne. Warszawa, 1986–1990. T. LI. Z. l. S. 31–48.
19. *Łowmiański H.* Studia nad początkami społeczeństwa i państwa litewskiego: w 2 t. Wilno, 1931–1932.
20. *Bialuński G.* Studia z dziewów plemion pruskich i jacwieskich. Olsztyn, 1999. Rozprawy i materialy OBN im. W. Kętrzyńskiego w Olsztynie. № 179. – 183 s.
21. *Hollak E.* // Zeitschrift fur Ethnologie. Anthropologie, Ethnologie und Urgeschichte. Berlin. 1908. Bd. 40, N 1–6. S. 145–193.
22. *Кулаков В. И.* Древности пруссов VI–XIII вв.: Свод археологических памятников СССР. Вып. Г 1–9. М., 1990. – 170 с.
23. *Кулаков В. И.* История Пруссии до 1283 г. (Prussia Antiqua. Т. 1). М., 2003. – 432 с.
24. *Кулаков В. И.* // Калининградская область. Атлас мира. Калининград, 2011. Т. 20. С. 67.



*S. P. VITSIAZ*

vit@history.minsk.by


**PRUSSIANS AREAL PROBLEM: HISTORIOGRAFIC DECISIONS**

## Summary


The basic histiriographic approaches to the reconstruction of Prussians areal are discussed: conservative (German historical and archeological schools); 2 – ethnos-oriented (Polish historical and archeological schools), 3 – archeology-oriented (Russian archeological school). The source study features of approaches 1 and 2 are found: the orientation mainly to the later Middle Ages writing sources, which makes their definition of Prussians areal (V-XIII centuries) hypothetic, unreliable. The definitions of Russian archeologists (V.I. Kulakov et al.) are distinguished as the most substantiated and reliable, but not enough interpreted historically. A conclusion is made that it is urgent to introduce the material of archeology into the context of historical studies of the early Middle Ages.